a) in crime fiction the event system dominates; the main thing is not an evolution of a character but a result. The hero is statistic. The event determines the text composition and creates a possibility for a character to act and not to develop.

b) as a result an investigator fulfils a limited set of functions in detective fiction – certifies a crime, decides to start an investigation, collects material evidences, traces a suspect, summarizes, thinks over and makes conclusions and at last reveals a criminal.

Literature:

1. John Babbington Williams Leaves from the Note-Book of a New York Detective – Yardley: Westholme Publishing, 2008. – 1-339 pp.
2. Heather Worthington The Rise of the Detective in Early Nineteenth-Century Popular Fiction – Palgrave: Palgrave Macmillan, 2005. – 19-21 pp.
3. Arthur Conan Doyle Sherlock Holmes – New Jersey: Castle, 1976. – 11-636pp.

## АСАБЛІВАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ ВІТАЛЬНЫХ МАТЫВАЎ У СУЧАСНАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ЛІРЫЦЫ

**Бараноўскі А.А.**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»,*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Брадзіхіна А.В., канд. філ. навук, дацэнт*

This science work is reflected the vital motives of the modern lyric poetry. The matter of current in this work is differentiation of the autorial conceptions.

Віталістычныя погляды пра надзеленасць жывых істот творчай сілай, якая абумоўлівае іх адзінства і гармонію, знайшлі сваё адлюстраванне не толькі ў біялогіі, але ў філасофіі і літаратуры. Мэтай нашага артыкула з’яўляецца вызначэнне спецыфікі рэалізацыі вітальных матываў у сучаснай філасофскай лірыцы. Метады даследавання – фенаменалагічны і герменеўтычны.

У сённяшняй «паэзіі думкі» нярэдка ствараюцца арыгінальныя мастацкія мадэлі быцця, не адпаведныя законам матэрыяльнага існавання. Канцэпцыі творчасці паэтаў-віталістаў можна ўмоўна падзяліць на

- арыентаваныя на ўсходнюю філасофію, згодна з якой мёртвае можа ажыць ці нарадзіць жывое (зб. «Танец з вужакамі» А.Разанава, «Там, за дзвярыма», «Фаўна сноў», «Паром праз Ля – Манш» У.Арлова);
- геданістычныя (зб. «Акропаль», «Стомленасць Парыжам» Л.Дранько-Майсюка);
- заснаваныя на разуменні метафізікі быцця (зб. «Герой вайны за празрыстасць» І.Бабкова, «Рэчаіснасць» А.Разанава);
- ідэі ўслаўлення кахання-іншабыцця і стварэнне фальшрэальнасці (зб. «Анадыямэна» Г. Дубянецкай).

Усе лірычныя героі вышэй названых аўтараў набываюць транзітыўныя якасці. Стан пераходнасці пры гэтым характэрны і для акаляючай прасторы: «Мы жывём у свеце, // дзе вечар змяняецца // раніцай, вясна – восенню, // жыццё – смерцю…» [1, с. 221].

У паэзіі У.Арлова пры наяўнасці сродкаў-медыумаў (люстэрка, студні і г. д.) законы фізікі пачынаюць падпарадкоўвацца лірычнаму герою: «Усё часцей сустракаю людзей, // што памерлі раней за маё нараджэнне» [2, с. 71]. Для падобнай канцэпцыі характэрна абсалютызацыя якаснай своеасаблівасці жывога, адмаўленне ролі хімічных і фізічных заканамернасцяў у ім, матэрыялістычнага тлумачэння з'яў жыцця. Верш у такім выпадку знешне максімальна набліжаецца да прозы, не губляючы, аднак, унутранай паэтычнасці.

Хісткасць мяжы паміж выдумкай і рэальнасцю ўласціва і паэзіі А.Разанава. Больш за тое, лірычны герой (калі ён увогуле з’яўляецца ў творы) сам выступае як асобнае вымярэнне, цэласны замкнёны свет: «І мы, здзіўляючыся, разумеем, // Што мы гэтаксама зямля, // У якой схаваныя нейчыя скарбы» [1, с. 346]. Улічваючы адсутнасць у вершах

А.Разанава «прамых» сродкаў пераходу ў іншасвет, абавязкова павінен быць фактар, які дазваляе падобны пераход здзейсніць. Калі звярнуцца да класічнай тэорыі віталізму, і ў прыватнасці да ідэі наяўнасці ў жывых аргагнізмаў «энтэлехіі» (душы), дадзены фактар становіцца відавочным: выступаючы нематэрыяльным і дзейсным па-за прасторай і часам, ён стварае прасторавую арганізацыю жывога, вызначае яе мэтазгоднасць.

Віталістычная канцэпцыя лірыкі Г. Дубянецкай грунтуецца на ідэі кахання-іншабыцця. Аўтарка асвойвае адмысловы варыянт сыходжання-разыходжання, спецыфічную разнавіднасць паводзін, феномен жыццябудавання па-за межамі матэрыяльнага жыцця, у прасторы кахання.

Эмацыйны напал пры гэтым узмацняецца настолькі, што лірычная гераіня з рук каханага гатова прыняць нават дамавіну: «Мой любы дамавіну мне зрабі // з рук тваіх» [3, с. 76]. Каханне ў Г. Дубянецкай, нават нешчаслівае, якраз і звязана з вітальным пачаткам яе мастацкага свету.

У аснову светапогляду лірычнага героя інтымна-філасофскіх рэфлексій Л.Дранько-Майсюка пакладзены геданізм. Гэта не азначае, тым не менш, што паўнавартаснасць жыцця суадносіцца толькі з фізічнай асалодай. Немалаважным з'яўляецца і наяўнасць душы: «Здаецца нічога не будзе // З таго, што ў пясок адышло, – // Хіба што душа ў перапудзе // Хоць нейкае знойдзе святло» [4, с. 74].

Разуменне метафізічнасці быцця ў паэзіі І. Бабкова выяўляецца праз стварэнне мультыверсму – шэрагу рэальнасцей, знітаваных паміж сабой. Адрознай прыкметай канцэпцыі аўтара выступае найперш адсутнасць падзелу на рэальнасць і фантазію, атаясамліванне жыцця і сну.

Такім чынам, сённяшняя філасофская лірыка прадстаўляе шырокую панараму ўяўленняў пра вітальны пачатак свету. Большасць віталістычных канцэпцый так ці інакш звязана з умовай адмаўлення ці абмежавання матэрыяльных законаў. Аўтары імкнуцца стварыць уласную мадэль быцця, арганізаваную па законах пачуццяў. Духоўнае пры гэтым не саступае месца матэрыяльнаму.

Спіс выкарыстаных крыніц:
1 Разанаў, А. Танец з вужакамі / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. – 462 с.
2 Арлоў, У. Паром праз Ля-Манш / У. Арлоў. – Мінск : Логвінаў, 2006. – 157 с.
3 Дубянецкая, Г. Анадыямэна / Г. Дубянецкая. – Мінск : Медисонт, 2008. – 96 с.
4 Дранько-Майсюк, Л. Паэтаграфічны раман / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Кніга, 2002. – 111 с.

## АФРОАМЕРИКАНСКИЙ ИСТОРИЧЕСКИЙ РОМАН. СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ

**Бахур И.Н.**
*Учреждение образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», г. Брест, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Стулов Ю.В., канд. филол. наук, доцент*

The article analyses the influence of slave narratives on the genre of Afro-American historical novel. The author draws a conclusion that it is possible to trace the presence of slave narratives in Afro-American historical novel on such levels as plot, composition and heroes.

За последние десятилетия в американской литературе произошли значительные изменения, в результате которых она стала рассматриваться как мультикультурная. Литературы этнических меньшинств, входящие в ее состав, выступают сейчас как самоценные, значимые и определяющие общеамериканский литературный процесс. Новая тенденция привела к тому, что афроамериканские писатели попытались, как пишет Г. Л. Гейтс, «пересмотреть понимание роли черных в американской истории» [1, с. 2012]. В качестве плацдарма для переоценки они выбрали жанр исторического романа. Целью данной работы является попытка проанализировать пути художественного воплощения идейных поисков афроамериканских авторов. Используя историко-литературный и сравнительно-